# ПРАМОВА СТАРШЫНІ ЦВК БССР тав. А. Г. ЧАРВЯКОВА



Адкрываючы ўсенародны мітынг працоўных Совецкай Беларусі, прысвечаны 16-й гадавіне вызвалення горада Менска і Беларусі ад белапольскай акупацыі і першай гадавіне ўзнагароджання Совецкай Беларусі ордэнам Леніна, старшыня ЦВК СССР і БССР тав. А. Г. Чарвякоў гаворыць:

— Таварышы, у гэты ўрачысты дзень усе працоўныя Беларусі сабраліся для таго, каб успомніць гераічныя подвігі Чырвонай армі, каб агдядзець слаўны шлях барацьбы за социялізм і азначыць вялікія перамогі ў социялістычным будаўніцтве БССР, каб выказаць радасць шчаслівых народаў Совецкай Беларусі.

У гэты ўрачысты час наша першая думка пачуццё любві і адданасці з асаблівай сілай, як магутны бурлівы паток, накіравана да таго, пад чыім кіраўніцтвам Совецкая Беларусь ператварылася ў квітнеючую ордэнаносную Совецкую Социялістычную Рэспубліку, імя каго з'яўляецца баявым заклікам і штандарам надзей працоўных усяго свету ў іх барацьбе за вызваленне—да таварыша Сталіна.

Толькі 16 год прайшло з таго часу, калі магутным наступам слаўнай Чырвонай арміі, падтрыманай паўстаўшым супроць акупантаў беларускім народам, былі разгромлены белапольскія легіёны, і Совецкая Беларусь вызвалілася ад белапольскай акупацыі.

Як хвіосна змяніўся твар нашай краіны! Замест паняволенай, бяспраўнай калоніі царскай Расіі Беларусь існуе як Саюзная Совецкая ... ўжаюць новы праект Канстытуцыі Саюза ССР, самай дэмакратычнай Канстытуцыі ў свеце, якая ўзнімае радасць будаўніка социялізма на велізарную вышыню.

Замест песень жудасці, турбот і безнадзейнасці, у якіх падняволены беларускі народ выліваў сваё гора, сёння радасны і шчаслівы народ спявае новыя песні, песні барацьбы і перамог, песні радасці і шчасця.

Усё гэта стала магчымым толькі дзякуючы таму, што Совецкая Беларусь вызвалілася ад белапольскай акупацыі і замацавалася як совецкая рэспубліка.

Усё гэта стала магчымым толькі дзякуючы таму, што на дапамогу зруйнаванай Совецкай Беларусі прышоў Совецкі Саюз, які сваімі клопатамі даў магчымасць працоўным Совецкай Беларусі цвёрда стаць на ногі і будаваць социялістычную гаспадарку.

Усё гэта стала магчымым дзякуючы таму, што ўся наша работа праходзіла пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, на аснове рашучай барацьбы за генеральную лінію партыі, у бязлітасным змаганні супроць ворагаў партыі, супроць ворагаў ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Кожны рабочы і работніца, кожны калгаснік і калгасніца, уся працоўная інтэлігенцыя Совецкай Беларусі ясна ўсведамляюць сабе тое, што шчаслівы залаты век для Совецкай Беларусі надышоў толькі дзякуючы таму, што ўсё наша жыццё і барацьба праходзяць пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі (большэвікоў), пад непасрэдным кіраўніцтвам

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы